оўваў або менталітэт прыватнага ўладальніка, або засілле архетыпічных каў. Праўда, сялянскія беспарадкі адназначна пахіснулі іх звычку хрыскай пакоры і безадказнага падпарадкавання, заўважалася адносная дэлізацыя манархічнай улады, пэўная трансфармацыя каштоўнасцей. І ўсё ж рыентацыя на рэвалюцыйныя пераўтварэнні традыцыйна заставалася ай моладзі. Існавалі і прамежкавыя тыпы адносін. Напрыклад, калі граія колы ваганіся паміж нейтральнасцю і кансерватызмам або ліберальнарэвалюцыйнасцю. Аднак глыбіня рэакцыі жыхароў краю не набыла такіх маштабаў, як у цэнтральных губернях Расійскай імперыі.

## 4.3. Палітычныя рэформы

***ены ў выбарчым заканадаўстве.*** Пачатак XX ст. у гісторыі Расійскай ім- гэта эпоха карэнных змен у лёсах шматмільённага насельніцтва краіны. дзей прывёў да крушэння традыцыйнага палітычнага ладу і ўсталявання форм грамадскіх адносін, уплыў якіх адчуваецца і сёння.

ıатлікія палітычныя партыі і групоўкі прадэманстравалі сваё бачанне ў дасягнення абвешчаных імі ідэалаў і прапаноўвалі ўласныя канцэпцыі развіцця краіны ўжо ў 1905–1906 гг. Царскі ўрад вымушаны быў распаалітычныя рэформы, якія тычыліся аграрнага сектара, органаў мясцоваıкіравання, адміністрацыйнага кіравання на месцах, школьнай, судовай, й і іншых сфер. Іх ініцыятар старшыня Савета міністраў П. А. Сталыпін ıў галоўную мэту – спыніць нарастанне сацыяльных супярэчнасцей.

чваючы ўрокі рэвалюцыі 1905–1907 гг. і з мэтаю барацьбы з нацыянальухамі, царскі ўрад усё шырэй выкарыстоўваў ідэалогію рускага нацыя-, асабліва ў шматнацыянальных рэгіёнах, сутнасць якой заключалазунгу «Россия для русских, и русские должны управлять ею». У ранг най дзяржаўнай палітыкі гэтая ідэалогія была ўзведзена П. Сталыпіным ня 1907 г., калі быў надрукаваны Маніфест аб роспуску II Дзяржаўнай змяненні «Положения о выборах». Змест гэтых «изменений» і шэраг іх захадаў у заканадаўстве, грамадска-палітычным, эканамічным жыцці шым далі падставы даследчыкам сцвярджаць, што ў перыяд ад 1907 да снаваў «третьеиюньский режим».

одле ўказа ад 3 чэрвеня 1907 г. права адмяняць выбарчыя законы і вывовыя захоўваліся за імператарам, што ішло ўразрэз з Маніфестам ад ычніка 1905 г. і Асноўнымі законамі Расійскай імперыі (1906 г.). Наткам акта 3 чэрвеня 1907 г. быў «Совет объединенного дворянства» – расійская дваранская арганізацыя, якая аказвала вялікі ўплыў на паамадзяржаўя. Некаторыя члены Савета выступалі за ліквідацыю Дзярдумы наогул. Але царызм на гэты крок не адважыўся, паколькі клапа«репутации» ў замежных крэдытораў.

ам былі прадпрыняты і прэвентыўныя меры для падтрымання парадку ку незадавальнення ў народзе ў сувязі з разгонам II Думы і выданнем

га выбарчага закона. 70 % губерняў заставаліся ці былі абвешчаны на ста-
ічы «усиленной охраны», якое ўводзілася на 1 год міністрам унутраных
ў ці генерал-губернатарам у тых мясцовасцях, дзе «общественный поря-
парушаўся «покушеннямн на существующий государственный строй».
ністрацыя атрымлівала права праводзіць вобыскі, высылаць падазроных
Генерал-губернатары маглі зачыняць навучальныя ўстановы, здымаць
ад чыноўнікаў усіх ведамстваў і выбарчых асоб, ствараць спецыяльныя
на-паліцэйскія каманды для падаўлення хваляванняў.

казам міністра ўнутраных спраў становішча «усиленной охраны» было
ягнута да 20 красавіка 1908 г. у Вільні і Смаргоні (Віленская губерня),
сама ў Гродне, Пружанскім і Кобрынскім паветах Гродзенскай губерні[1].
ільная ўвага ў Заходнім краі надавалася Мінскай губерні і Мінску, дзе так-
захоўвалася становішча «усиленной охраны»[2]. Газета «Речь» паведамляла,
з раніцы 3 чэрвеня ў горад былі сцягнуты ахоўнікі, якія патрулявалі на ву-
к. Акрамя таго, у Мінск былі выкліканы два батальёны пяхоты[3]. У кастрыч-
1907 г. толькі ў Мінскай губерні ў баявой гатоўнасці знаходзіліся 4 палкі
ты, 6 спецыяльных рот салдат і 2 артылерыйскія брыгады.

асля 3 чэрвеня 1907 г. былі разгромлены шматлікія арганізацыі, якія ўзні-
гады рэвалюцыі: з 1906 па 1912 г. у Расійскай імперыі было закрыта звыш
саюзаў і каля 500 не атрымалі дазволу на рэгістрацыю. У гэты перыяд на
торыі беларуска-літоўскіх губерняў было закрыта каля 40 буйных праф-
заў, у тым ліку ў Мінску – 11, Віцебску – 16, Магілёве – 4. Мінскі і Віцебскі
рнатары ў другой палове 1907 г. выдалі шэраг цыркуляраў, патрабуючы ад
цыі распачаць крымінальнае пераследаванне прафсаюзаў. Выбарчы закон
чэрвеня 1907 г. рэзка павялічваў прадстаўніцтва ад землеўласнікаў і буйной
куазіі за кошт скарачэння колькасці выбаршчыкаў ад сялян на губернскіх
ах. На гэтых сходах непасрэдна адбываліся выбары дэпутатаў у Дзяржаў-
думу. Землеўладальніцкай (памешчыцкай) курыі давалася 49,6 % агуль-
колькасці выбаршчыкаў для 50 губерняў Еўрапейскай Расіі, замест 32,7 %
даў пры выбарах у першыя дзве Думы. Буйной буржуазіі, якая складала
рад гарадскіх выбаршчыкаў, было дадзена права абраць 15 % выбаршчыкаў;
най буржуазіі і інтэлігенцыі (ІІ разрад) – 11 %. Рэзка скарачалася колькасць
аршчыкаў ад сялян ( з 42,3 % да 21,8 %).

У заходніх губернях колькасць выбаршчыкаў ад землеўласнікаў павялічва-
на 15,5 % і складала 47,6 %, а ад сялян зменшылася на 8,3 % (да 29,6 %).
землеўладальніцкая курыя атрымлівала меншую колькасць выбаршчыкаў,
у Расіі, а скарачэнне выбаршчыкаў ад сялян у параўнанні з паказчыкамі
асіі было нязначным. Такія асаблівасці выбарчага закона ў Заходнім краі

[1] РДГА. – Ф. 1276. Воп. 3. Спр. 176. Арк. 137–138.
[2] Там жа. – Арк. 34.
[3] [Мінск. Да роспуску Думы] // Речь. – 1907. – 8 июня. – С. 3.



Пасяджэнне
Дзяржаўнай думы
Расійскай імперыі

тлумачыліся імкненнем урада зменшыць прадстаўніцтва ў Думе «польских помешиков», якія складалі большую частку мясцовых землеўладальнікаў-дваран. Галоўная стаўка была зроблена на дваран, бо менавіта яны складалі большасць паўнацэнзавых выбаршчыкаў. У 5 заходніх губернях іх налічвалася больш за 3 тысячы, ці 76,5 % ад усёй колькасці землеўласнікаў, што мелі права ўдзельнічаць у павятовых з'ездах землеўласнікаў[1].

Дзяржаўныя думы першых двух скліканняў нечакана для ўлады прадэманстравалі сваю шматнацыянальнасць. Нагадаем, што ў І Думе 13 польскіх дэпутатаў ад беларуска-літоўскіх губерняў стварылі «Группу западных окраин» (у друку яе яшчэ называлі «Территорнальное коло»); у ІІ Думе дэпутаты-палякі ад заходніх губерняў (12 чалавек) арганізавалі «Круг польскнх депутатов-конституционалистов Литвы н Руси». Яны патрабавалі вырашэння аграрнага пытання органамі мясцовага кіравання, гэта значыць, мясцовай (польскай) элітай. Дэпутаты з думскай трыбуны прэзентавалі свае этнаканфесійныя і рэгіянальныя патрабаванні.

Для грамадства стала відавочнай вастрыня нацыянальнага пытання, а для ўлады – пагроза сістэмаўтваральным асновам Расійскай імперыі. Таму ў выбар-

[1] Выборы в Государственую думу третьего созыва. Статистический отчет особого делопроизводства. – СПб., 1911.

чым законе ад 3 чэрвеня 1907 г. скарацілася прадстаўніцтва ад нацыяльных рэгіёнаў і ўскраін.

***Нацыянальныя курыі і аддзяленні па нацыянальнасці.*** Акрамя таго, улічваючы «просьбы» аб дапамозе, якія пастаянна паступалі з заходніх губерняў ад «Союза русского народа» (СРН), «Союза 17 октября» аб абароне праву «коренного русского населения»[1], міністр унутраных спраў распарадзіўся аб раздзяленні з'ездаў землеўласнікаў на «русское» і «польское» аддзяленні ў Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях. Да «русского» аддзялення былі аднесены праваслаўныя беларусы, немцы, татары; да «польского» – беларускія сяляне-каталікі і латышы (у Віцебскай губерні). Рускае насельніцтва Віленскай губерні атрымала права выбіраць свайго дэпутата ў Думу асобна ад іншага насельніцтва.

Паводле новага выбарчага закона яўрэйскае насельніцтва заходніх губерняў было фактычна пазбаўлена магчымасці сваім удзелам аказаць які-небудзь уплыў на вынікі выбараў. Так, першыя з'езды ва ўсіх гарадах Мінскай губерні былі падзелены на тры аддзяленні: да першага былі аднесены выбаршчыкі «русской» нацыянальнасці (далучаліся праваслаўныя беларусы, немцы, татары), да другога – «поляки» (далучаліся беларускія сяляне-каталікі), да трэцяга – яўрэі. Кожнае з аддзяленняў выбірала аднаго выбаршчыка, незалежна ад колькасці ўласных выбаршчыкаў. Напрыклад, у Мінскім павеце па адным выбаршчыку выбіралі 154 «русских» (куды ўваходзілі і 6 татар і 11 немцаў), 241 «поляк» і 844 яўрэі[2].

На два аддзяленні («русские» і «нерусские») падзяляліся гарадскія выбаршчыкі ў Дзвінскім, Гродзенскім, Беластоцкім і Бабруйскім паветах[3]. У Віленскім павеце адно аддзяленне з'езда складалі асобы «польского» паходжання, а другое – «лнца, которые не принадлежалн к польской национальности».

Другая гарадская курыя ў Мінскім павеце была падзелена на два аддзяленні: да першага адносілі асоб «русской», а да другога – асоб іншых нацыянальнасцей. «Русские» гарадскія аддзяленні па другой гарадской курыі былі створаны таксама ў Гродзенскім і Бабруйскім паветах і забяспечвалі мясцовым чыноўнікам і святарам «своего» дэпутата. Асаблівасці палітыкі царызму ў беларуска-літоўскіх губернях былі звязаны са спецыфікай сацыяльна-класавага і нацыянальнага складу, у першую чаргу пануючых класаў, і імкненнем царызму зменшыць ролю палякаў і яўрэяў у эканамічным і палітычным жыцці краю.

Стварэнне нацыянальных курый і аддзяленняў па нацыянальнасці і далучэнне, паводле ўрадавых актаў, праваслаўных беларусаў да ліку рускіх, а каталікоў да палякаў фактычна азначала адмаўленне царызмам факта існавання беларускай нацыі, яе мовы, культуры. Штучным аб'яднаннем у адной курыі

[1] ДАРФ. – Ф. 102. Воп. 237. Спр. 110. Арк. 12.

[2] НГАБ. – Ф. 1067. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 4–15.

[3] Выборы в Государственную думу III созыва: статистический отчет особого делопроизводства по выборам в Государственную думу. – СПб., 1911. – С. 83.

прадстаўнікоў розных сацыяльных пластоў насельніцтва ў Віленскай губерні ўрад імкнуўся стварыць бачнасць адсутнасці класавых адрозненняў паміж імі. Далучаныя паводле закона ад 3 чэрвеня да пануючай нацыі і атрымаўшыя перавагу ў барацьбе з яўрэйскай і польскай буржуазіяй і землеўласнікамі правыя з мясцовых аддзяленняў «Союза русского народа», праваслаўных брацтваў, аб'яднаныя ў таварыстве «Крестьянпн», у артыкуле «Россня для русскнх!» пісалі, што прыйшоў час гаварыць аб тым, што Расія павінна належаць рускім і яны павінны ёю кіраваць: «Желаешь жнть с Россней, подчнняйся ее законам и властн, не желаешь – чистого пути»[1]. Такім чынам, урад імкнуўся не дапусціць у склад дэпутатаў Думы «ннородцев» і «иноверцев», зыходзячы з таго, што Дзяржаўная дума павінна быць рускай і па духу. У выніку прадпрынятых урадам мер па зменах у выбарчым законе, дзейнасці Міністэрства ўнутраных спраў па «блокнровке» «нерусскпх элементов» на месцах, актывізацыі праўрадавых партый у час выбарчых кампаній, актыўнай пазіцыі праваслаўных святароў нацыянальны склад ІІІ Дзяржаўнай думы быў наступны: велікарусы – 338 дэпутатаў (77 %), украінцы – 28 (6 %), беларусы – 18 (4,3 %), палякі – 18 (4,3 %), немцы – 12 (2,3 %), армяне, башкіры, татары – 4 %, яўрэі, эстонцы, малдаване, грэкі – 2 %[2].

Ад Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў у ІІІ Дзяржаўную думу было абрана 36 дэпутатаў. З іх 80,5 % з'яўляліся прадстаўнікамі праўрадавых партый, у той час як па Расійскай імперыі ў цэлым – 61,5 %. У заходніх губернях уплыў правых партый на выбаршчыкаў, асабліва сялян, быў больп значным, чым па краіне ў цэлым. З 36 дэпутатаў ад Беларусі ў Думу прайшло 11 сялян. Дзевяць з іх абвясцілі сябе велікарускімі нацыяналістамі і ў 1910 г. уліліся ў шэрагі «Партнп русскнх нацноналнстов», створанай П. Сталыпіным. Галоўная пункты яе праграмы прадугледжвалі панаванне праваслаўнай царквы і рускай народнасці, барацьбу з яўрэйствам, рэлігійную скіраванасць народнай адукацыі. Вынікі выбараў яшчэ раз прадэманстравалі, што ў Заходнім краі праваслаўнае насельніцтва хілілася да правых партый, а левыя ў асноўным перамагалі галасамі «нерусскнх» выбаршчыкаў.

***Палітычны аспект аграрнай рэформы П. Сталыпіна.*** Адпаведна перакананням П. Сталыпіна, новую моц і прэстыж вярхоўнай уладзе мог надаць прадстаўнічы лад. Склад ІІІ Дзяржаўнай думы дазваляў спадзявацца, што ад дэмагогіі і апазіцыйнасці (як гэта было ў Думе І і ІІ скліканняў) дэпутаты пачнуць канструктыўную працу, заснаваную на супрацоўніцтве думскай большасці (фракцыя акцябрыстаў, рускіх нацыяналістаў і цэнтра) з урадам. Сацыяльную апору царскай уладзе на месцах павінен быў скласці заможны вольны селянін – вызвалены з абшчыны прыватны ўласнік, які стаў стрыжнем

[1] Голос нз деревнн. «Россия для русских!» // Крестьянин. – 1909. – 24 марта. – С. 1–2.

[2] Забаўскі М. М. Расійская Дзяржаўная дума ў лёсах Беларусі (1906–1917 гг.). – Мінск, 2008. – С. 149.



Пётр Сталыпін – прэм'ер-міністр Расійскай імперыі, Гродзенскі губернатар у 1902–1903 гг.

дробнай самакіраванай земскай адзінкі. Такім чынам, селяніну-ўласніку надавалася большая палітычная вага ў вёсцы. Стаўка на разбурэнне абшчыны і насаджэнне «сильного крестьянина» мела дзве задачы: адвесці сялян ад барацьбы за абшарніцкія землі і перацягнуць сялянскія вярхі на бок урада. У распачатай у 1906 г. П. Сталыпіным эканамічнай рэвалюцыі буйны эканаміст таго часу, член-карэспандэнт Расійскай Акадэміі навук А. І. Чупроў убачыў пачатак рэвалюцыі сацыяльнай. Калі прэм'ер прасіў для рэалізацыі аграрнай рэформы 15–20 гадоў спакою, А. Чупроў заяўляў, што гэтая рэформа праз 10 гадоў прывядзе да сацыяльнага выбуху[1]. З ім былі згодны многія эканамісты і палітыкі. Так, князь Я. М. Трубяцкой пісаў, што Сталыпін, распачаўшы разбурэнне абшчыны для стварэння пласта заможных сялян-уласнікаў, здольных быць апорай урада, практычна садзейнічаў не ўмацаванню асноў рускай дзяржавы, а росту будучай буржуазнай дэмакратыі. Далей князь заяўляў, што галоўным арганізатарам парэформеннай вёскі стаў небяспечны для існуючай улады элемент – інтэлігенцыя. Яна хлынула ў вёску ў ходзе аграрных перамен і заняла дамінуючае месца ў кааператыўным руху, які ўзнік як рэакцыя сялян на разбурэнне абшчыны.

У заходніх губернях існавала свая спецыфіка ўмоў для рэалізацыі рэформы. У Мінскай і Гродзенскай губернях абшчыннае землеўладанне знікла даўно, а ў Віленскай яно не перавышала 0,5 %. Толькі ў Магілёўскай губерні абшчынныя землі складалі 79,2 % і ў Віцебскай 44,6 % ад усіх сялянскіх зямель[2]. Менавіта таму сталыпінская рэформа сялянскай землеўласнасці пачала праводзіцца найбольш выразна і цвёрда тут, дзе хутары ўжо існавалі, і дзе значная колькасць заможных сялянскіх гаспадарак расчысцілі ёй шлях. Стаўка на беларускае заможнае сялянства як нідзе ў Расійскай імперыі была такой выразнай і значнай, таму што дасягала сваёй мэты па трох кірунках: сацыяльным – у барацьбе з рэвалюцыяй, нацыянальнай – у змаганні з пальшчызнай, рэлігійнай – у знішчэнні каталіцтва. На чале новай апоры ўлады у краі выступалі «западно-руссы».

У 1907 г. у Вільні, акрамя таварыства «Крестьянин», узнікла групоўка «Окраинный союз», якая ставіла сваёй мэтай узмацненне расійскай культуры і дзяржаўнасці на «заходняй ускраіне». Змагаючыся з рэвалюцыяй, члены «Русского окраннного союза» (РОС) імкнуліся ліквідаваць эканамічнае панаванне і палітычны ўплыў у краі польскіх землеўласнікаў і яўрэйскай буржуазіі.

[1] Егоров Ю. Чупров протнв Столыпнна // Былое : ежемесяч. прнл. к журн. «Родина». – 996. – № 5. – С. 3.

[2] Гісторыя Беларускай ССР. – Мінск, 1972. – Т. 2. – С. 438.

Своеасабліва яны планавалі вырашыць у беларуска-літоўскіх губернях аграрнае пытанне. Была вылучана прапанова скарыстаць прускі вопыт – прымусова выкупіць землі польскіх землеўласнікаў. Так, Д. В. Скрынчанка заяўляў, што няхай дзяржава не скупіцца на сродкі, каб выкупіць «польские земли», а калі сама не ў стане гэта зрабіць, то вызначыць кошт, па якім памешчыкі будуць абавязаны прадаць рускім свае землі. Урад разумеў, што ў барацьбе за «новую Россию» супраць польскіх устояў «западно-руссы» – адзін з галоўных саюзнікаў улады.

***Рэформа мясцовага самакіравання ў Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях.*** Адлюстраваннем палітычных і, безумоўна, гаспадарчых інтарэсаў П. Сталыпіна ў заходніх губернях быў праект земства, распрацаваны ў 1906 г. Яго афіцыйная назва – «Об использованни “Положенпя о земских учреждениях от 12 июня 1890 г.” к губернням Витебской, Волынской, Киевской, Мннской, Могилевской, Подольской». Законапраект грунтаваўся на Палажэнні 1890 г., але ў яго, у адпаведнасці з нацыянальнымі планамі П. Сталыпіна, быў унесены шэраг істотных змяненняў. Замест саслоўных курый (сялянскай і абшарніцкай) уводзіліся курыі нацыянальныя – «русская» і «польская». У «русскую» курыю ўключалася праваслаўнае беларускае насельніцтва, а ў «польскую» – каталіцкае.

Далучаючы да «русской» курыі праваслаўных беларускіх сялян, улады забеспечвалі ў Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях яе большасць на выбарах. У сувязі з тым, што ў Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях не толькі дваранства, але ў значнай ступені і сялянства былі каталікамі, то нават і па такой сістэме падліку перавагу мела б «польская» курыя. Таму ўвядзенне земстваў у названых губернях не дапускалася. Законапраект аб заходнім земстве быў разлічаны на збліжэнне заможнай праслойкі беларускіх і ўкраінскіх сялян з рускімі памешчыкамі на платформе рускага нацыяналізму і аслаблення ўплыву «польских» землеўласнікаў.

Увядзенне мясцовага самакіравання ў Заходнім краі было складовай часткай сталыпінскай аграрнай рэформы. І таму не столькі абарона інтарэсаў «русского» насельніцтва краю, як гэта можа здацца на першы погляд, хвалявала прэм'ер-міністра, колькі магчымасць вывесці на палітычную арэну сапраўды «русское» заможнае сялянства. Выступаючы ў Дзяржаўным савеце, ён адзначыў, што «экономическое возрождение мы строим на наличии покупательской способности зажиточного слоя на низах… наналпчии этого элемента держатся и наши законопроекты об улучшенни местной земской жнзни»[1].

У аснову праекта земскай рэформы былі пакладзены прынцып бессаслоўнасці і шматступенчатасці земскіх органаў: валаснога, павятовага, губернскага. Ніжэйшай ступенню сістэмы мясцовага самакіравання прадугледжвалася зрабіць сельскае таварыства (акругу) з абшчыннымі і прыватнаўласніцкімі землямі,

[1] Выборы в Государственную думу III созыва: статистический отчет особого делопроизводства по выборам в Государственную думу. – С. 49.

акрамя абшарніцкіх. Далей ішла воласць, якая ахоплівала тэрыторыю і ўключала ў сябе сельскія таварыствы і прыватныя ўладанні, што мелі статус сельскіх акруг. На чале воласці знаходзіўся выбарчы распарадчы орган. У склад воласці ўжо ўключаліся і абшарніцкія землі, на якія перакладвалася частка валасных грашовых павіннасцей.

Меркавалася размеркаванне выбаршчыкаў на чатыры курыі і паніжаўся выбарчы цэнз. У першую і другую курыі ўключаліся ўсе землеўласнікі ў залежнасці ад памеру ўладанняў; у трэцюю – уладальнікі гарадскіх маёмасцей і гандлёва-прамысловых прадпрыемстваў. Ад валасных земстваў (чацвёртая курыя) маглі быць абраны і сяляне. У праекце, такім чынам, ураўноўваліся правы землеўласнікаў дваранскага і недваранскага паходжанняў.

Праект рэформы мясцовага самакіравання, падрыхтаваны ўрадам для III Дзяржаўнай думы, абмяркоўваўся і на I Усерасійскім з’ездзе земскіх дзеячаў у Маскве (чэрвень 1907 г.). Правыя земскія дзеячы, якія дамінавалі на з’ездзе і часткова падтрымалі сталыпінскую аграрную рэформу, сталі ў апазіцыю да ўрадавага праекта земскай рэформы і накіравалі яго на абмеркаванне ў земскія сходы.

Важным момаитам у рэформе адміністрацыйнага кіравання на месцах была замена павятовага прадвадзіцеля дваранства на ўрадавага чыноўніка ў якасці кіраўніка павета. У такім жа кірунку ішла і замена земскага начальніка-дваранiна павятовым начальнікам без саслоўнага цэнзу. А па новым праекце судовай рэформы, зацверджаным Саветам міністраў 19 і 23 студзеня 1907 г., дазвалялася абіраць у суддзі асоб без вышэйшай адукацыі.

Дваранства і правыя выступалі з крытыкай аграрнай палітыкі ўрада. На самай справе іх хвалявалі наступныя палажэнні рэформы: адхіленне прадвадзіцеля дваранства ад кіруючай ролі ў павеце, стварэнне ўсесаслоўнай воласці і пашырэнне земскага выбарчага права. Ужо вясной 1907 г. менавіта па «политическим мотивам» правыя з прыдворных колаў, чарнасоценных нізоў выступалі за замену П. Сталыпіна і яго каманды (І. Я. Гурлянда, С. Я. Крыжаноўскага і інш.) на кабінет иа чале з П. М. Дурнаво.

Закоиапраект аб заходнім земстве быў найбуйнейшым з усіх, якія абмяркоўваліся ў III Дзяржаўнай думе (1907–1912 гг.). Дыскусія наконт яго палажэнняў разгарнулася ў асноўным паміж кадэтамі і правымі, якія згуртаваліся ў адным – крытыцы П. Сталыпіна як ініцыятара законапраекта. Першыя абвінавацілі прэм’ера ў нацыяналізме, другія – у яго адсутнасці, у пагрозе ўсяго «русского дела» ў Заходнім краі. Для падтрымкі ўрадавага законапраекта 1 лютага 1911 г. у Думе выступіў П. Сталыпін. Ён быў перакананы, што без дзяржаўнай падтрымкі «русского элемента» земствы стануць зброяй у палітычнай барацьбе палякаў супраць рускага панавання ў заходніх губернях.

Пасля яго выступлення на думскую трыбуну ўзышоў дэпутат ад Магілёўскай губерні У. Войніч-Сянажэцкі, які адзначыў выключна палітычныя мэты ўрадавага праекта і галоўнае з іх – адхіленне ад земстваў мясцовых землеўлас-

нікаў, зніжэнне створанай імі культуры і перадача земскага самакіравання ў ру
рускіх памешчыкаў, у выніку чаго земствы будуць займацца не гаспадарчым
а палітычнымі справамі. 10 сакавіка 1911 г. прадстаўнікі польскіх колаў атры
малі аўдыенцыю ў Мікалая II. Размова ішла аб земскай рэформе. Але яе лёс бы
ужо вырашаны.

Законапраект П. Сталыпіна быў прыняты Думай. Але Дзяржаўны сав
4 сакавіка 1911 г. 92 галасамі супраць 68 адхіліў падзел выбаршчыкаў на н
цыянальныя курыі. Прэм'ер-міністру ўдалося пераканаць Мікалая II і правес
закон без ухвалення яго прадстаўнічымі органамі.

Але толькі ў 1913 г., пасля завяршэння тэрміну абрання членаў Дзяржаўна
савета ад з'ездаў землеўласнікаў, земскія сходы змаглі абраць сваіх прадста
нікоў у верхнюю палату. Сярод іх былі: ад Віцебскай губерні – Я. Н. Афрос
маў, ад Мінскай – адстаўны палкоўнік, буйны землеўласнік Бабруйскага паве
Р. А. Лашкароў, ад Магілёўскай – лідар мясцовых акцябрыстаў М. М. Друцкі-С
калінскі. Прадстаўнікамі ў Дзяржаўным савеце ад Віленскай і Гродзенскай г
берняў сталі землеўласнікі С. І. Лапацінскі і К. Г. Скірмунт.

***Праект рэформы сістэмы адукацыі.*** Праект увядзення ўсеагульнай пача
ковай адукацыі таксама быў часткай палітычных мерапрыемстваў урада, п
колькі вясковай буржуазіі, якая атрымлівала прадстаўніцтва ў мясцовым сам
кіраванні, неабходна было забяспечыць адукацыйны цэнз. Яшчэ ў кастрычні
1910 г. III Дзяржаўная дума прыступіла да разгляду «Положения о начальны
учнлпщах». Пры яго абмеркаванні на першае месца былі вылучаны пытанні
мове выкладання ў школах Расійскай імперыі і становішчы царкоўнапрыхо
скіх школ. Дакладчык па законапраекце П. Георгіеўскі заявіў, што ў Расіі, д
больш чым сто народнасцей, якія стаяць на розных ступенях развіцця, гавора
на розных мовах, павінна быць адзіная і агульная руская дзяржаўная мова. П
абмеркаванні гэтага пытання высокую актыўнасць праявілі правыя дэпутаты
беларуска-літоўскіх губерняў, асабліва епіскап Гомельскі Мітрафан (Д. Красн
польскі) і інспектар народных вучылішчаў Гродзенскай губерні В. К. Тычын
якія галасавалі за прапановы ўрада і імкнуліся не дапусціць у школы захо
ніх губерняў польскай, яўрэйскай і беларускай моў. «Единство русского гос
дарственного языка, преподавание во всех правнтельственных, общественн
и частных школах нсключнтельно на русском языке»[1], – такой была платфор
Віленскага «Русского национального союза». У той жа накіраванасці сістэм
тычна вяла прапаганду газета «Белорусская жизнь» (друкаваны орган пра
акцябрысцкага «Белорусского общества»). Прыярытэтным кірункам апош
стала дзейнасць супраць газеты «Наша Ніва»[2].

З пачаткам Першай сусветнай вайны ўрад здзейсніў рашучы крок у сп
ве нацыянальнай адукацыі. Пад кіраўніцтвам міністра народнай асве

[1] Виленский русский национальный союз // Северо-западная жизнь. – 1912. – 11 марта. – С
[2] Вильна, 27 января // Белорус. жизнь. – 1911. – 27 янв. – С. 1.

П. М. Ігнацьева быў распрацаваны праект рэформы сістэмы адукацыі, у якім прадугледжвалася, што абноўленая школа павінна быць «нацыянальнай» і садзейнічаць выхаванню ў вучняў агульнарасійскай нацыянальнай самасвядомасці. У вучэбных планах дамінавала руская мова, літаратура, гісторыя і геаграфія Расіі. Тым не менш нярускім народам планавалася магчымасць вывучэння, у тым ліку і ў сярэдняй школе, культурнай спадчыны сваіх народаў. Але П. Ігнацьеў быў вымушаны пайсці ў адстаўку, і яго праекты засталіся толькі ў планах.

У жніўні 1914 г. пры абмеркаванні бюджэту Міністэрства народнай асветы ў IV Дзяржаўнай думе ксёндз С. Г. Мацэевіч зноў узняў пытанне аб стане адукацыі ў Віленскай навучальнай акрузе. Ён указаў на імкненне мясцовага кіраўніцтва да моўнай русіфікацыі ўсяго навучальнага працэсу, уключна з выкладаннем Закона Божага, і адзначаў, што ахвярамі гэтай палітыкі былі не толькі палякі, але і літоўцы, латышы, беларусы, украінцы. С. Мацэевіч імкнуўся нераканаць дэпутатаў у неабходнасці павялічыць фінансаванне агульнаадукацыйных школ і крытыкаваў прапановы крайне правага дэпутата Г. Г. Замыслоўскага (Віленская губерня) аб неабходнасці ўзмацнення выдаткаў на дзейнасць царкоўнапрыходскіх школ[1].

У першае дзесяцігоддзе XX ст. улада вылучалася кампраміснасцю сваёй палітыкі і курсам на завяршэнне дзяржаўнай еўрапеізацыі краіны. Аб гэтым сведчылі Маніфест ад 17 кастрычніка 1905 г., скліканне Дзяржаўнай думы, палітычныя рэформы ў органах кіравання, сферы школьнай адукацыі, змены ў аграрным, рабочым і нацыянальным пытаннях. Пры П. Сталыпіне палітыка лавіравання практычна вызначала сутнасць усяго ўнутрыпалітычнага кірунку царскага ўрада. Кіруючыя колы разумелі непазбежнасць новай рэвалюцыі і прымалі меры, якія, на іх погляд, маглі спыніць рух краіны да рэвалюцыйнай катастрофы. Першым крокам у гэтым напрамку стала замена выбарчага заканадаўства («Положение о выборах в Государственную Думу» ад 6 жніўня 1905 г.; указ ад 11 снежня 1905 г.; выбарчы закон ад 3 чэрвеня 1907 г.). Аграрная, земская, рабочая і іншыя рэформы, якія праводзіліся ўрадам П. Сталыпіна ў 1907–1914 гг., былі палітычна арыентаваныя, асабліва ў інтарэсах урадавай апоры – праўрадавых партый.

## 4.4. Дзейнасць палітычных партый у 1907–1914 гг.

***Манархічныя партыі і арганізацыі.*** У другой палове 1907 г. у цэнтры ўвагі ўсіх палітычных сіл і партый Расійскай імперыі былі адносіны да выбарчай кампаніі ў III Дзяржаўную думу. Савет аб'яднанага дваранства – галоўная партыя кансерватараў – накіроўваў перадвыбарчую дзейнасць усіх манархічных партый і арганізацый. 17–19 чэрвеня 1907 г. праходзіў усерасійскі з'езд

[1] Смалянчук А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях, 1864–1917 гг. – Гродна, 2001. – С. 201.